www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

26 студзеня 2006 года, № 2 (1932)

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Мы – першыя!

Першае агульнакаманднае месца заняла каманда ліцэя БДУ на міжнароднай Жаўтыкоўскай алімпіядзе па фізіцы і матэматыцы сярод навучэнцаў спецыялізаваных фізіка-матэматычных школ.

Гэтае творчае спаборніцтва праходзіла 16—19 студзеня ў Алма-Аце. Удзел у ім узялі больш за 200 школьнікаў з 11 краін: Інданезіі, Турцыі, Румыніі, Узбекістана, Кіргізіі, Таджыкістана, Азербайджана, Арменіі і Казахстана, а таксама прадстаўнікоў такіх знакамітых навучальных устаноў, як спецыялізаваныя фізіка-матэматычныя школы пры МДУ і Санкт-Пецярбургскім універсітэце (Расія).

У складзе каманды ліцэя БДУ выступалі адзінаццацікласнікі Руслан Максімаў, Міхаіл Карпук і Андрэй Полаз, а таксама навучэнцы 10-га класа Яўген Галіноўскі і Максім Севялёў. У агульнакамандным заліку нашыя хлопцы заваявалі першае месца па матэматыцы і чацвёртае — па фізіцы. А ў асабістым заліку залатыя медалі атрымалі юныя матэматыкі Руслан Максімаў і Яўген Галіноўскі, фізік Андрэй Полаз.

Бліскучае выступленне нашай каманды, якая ўпершыню прыняла ўдзел у гэтай алімпіядзе, асабліва адзначыў Кайраш Макашаў — дырэктар рэспубліканскай спецыялізаванай фізіка-матэматычнай школы-інтэрната імя Арамбека Жаўтыкова, на базе якой і праходзілі ўжо ў другі раз гэтыя творчыя спаборніцтвы. Варта зазначыць, што на рахунку гэтай школы 42 перамогі на такіх міжнародных фізіка-матэматычных турнірах.

Алімпіяда ў Алма-Аце праводзіцца ў гонар вядомага казахстанскага акадэміка і выдатнага навукоўца-матэматыка Арымбека Жаўтыкова пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і навукі Казахстана.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ
Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

КАБ БЫЦЬ ФЛАГМАНАМ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ, ТРЭБА ПАСТАЯННА РАЗВІВАЦЦА

Рэктар БДУ прафесар Васіль СТРАЖАЎ расказвае, як універсітэт рыхтуецца да юбілею, чым жыве сёння, што чакае яго ў бліжэйшай перспектыве

Стар. 2

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Маразы не нанеслі вялікай шкоды ацяпляльнай сістэме БДУ. Сур'ёзных збояў у яе рабоце пакуль не назіраецца, сітуацыя знаходзіцца пад пільным кантролем, паведаміў на пасяджэнні рэктарата прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце Уладзімір Рагавіцкі. Але тым не менш, адзначыў рэктар Васіль Стражаў, прынята рашэнне адмяніць заезд студэнтаў у САК "Брыганціна" ў сувязі з нізкай тэмпературай. Ён падкрэсліў, што ў такіх сітуацыях яшчэ больш відавочна, як неабходна ў маі гэтага года завяршыць будаўніцтва кацельні "Брыганціны", як і запланавана.

Наш універсітэт рыхтуецца да ўдзелу ў нацыянальных выставах Беларусі на Кубе і ў Сірыі. Па словах першага прарэктара Сяргея Рахманава, яны адбудуцца сёлета ў лютым і маі. У рамках гэтых візітаў дэлегацыя БДУ абмяркуе канкрэтныя кантакты нашага універсітэта з ВНУ гэтых краін.

Прарэктар па вучэбнай рабоце Уладзімір Клюня расказаў пра святкаванне ў расійскай сталіцы 75-годдзя Маскоўскага лінгвістычнага універсітэта (былога Інстытута замежных моў імя Марыса Тарэза). БДУ з гэтай адной з найстарэйшых расійскіх ВНУ звязвае даўняе супрацоўніцтва ў адукацыйнай і навуковай сферах. Уладзімір Клюня перадаў рэктару Маскоўскага лінгвістычнага універсітэта віншаванне і падарунак ад калектыву БДУ.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ВІНШУЕМ!

ЛІЦЭЙ СВЯТКУЕ

2—4 лютага ліцэй БДУ будзе святкаваць свой 16-ы дзень нараджэння.

2 лютага адбудзецца ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае гэтай даце.

На **3 лютага** прызначана навукова-практычная канферэнцыя ліцэістаў. У гэты ж дзень у 19 гадзін пройдзе вечар сустрэчы выпускнікоў.

4 лютага будзе наладжана спартыўнае свята.

ПАДЗЕІ

З ДНЁМ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ!

Сёння ў будынку геафака адбудзецца святочнае мерапрыемства, прысвечанае Дню беларускай навукі, які наша краіна будзе адзначаць 29 студзеня. З дакладам выступіць першы прарэктар БДУ, прафесар Сяргей Рахманаў.

На свята запрошаны студэнты, магістранты, аспіранты.

Найлепшыя з іх атрымаюць узнагароды і прэміі.

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

В.І. СТРАЖАЎ:

“КАБ БЫЦЬ ФЛАГМАНАМ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ, ТРЭБА ПАСТАЯННА РАЗВІВАЦЦА”

30 кастрычніка Беларускі дзяржаўны універсітэт адзначыць свой 85-ы дзень нараджэння. Пра тое, як універсітэт рыхтуецца да юбілею, чым жыве сёння, што чакае яго ў бліжэйшай перспектыве, газеце “Універсітэт” расказаў рэктар БДУ прафесар Васіль Іванавіч СТРАЖАЎ.

— Хацеў бы адразу падкрэсліць, што юбілей мы збіраемся адзначаць без вялікага размаху, бо праз 5 год БДУ споўніцца 90 і гэтая дата запатрабуе больш грунтоўнай падрыхтоўкі. Тым не менш, мы рыхтуемся і да сёлетняга святкавання: створаны аргкамітэт на чале з першым прарэктарам Сяргеем Кімавічам Рахманавым, распрацаваны пэўныя прапановы. Да прыкладу, запросім у кастрычніку гасцей на навукова-практычную канферэнцыю, упершыню будзе створаны дакументальны фільм пра БДУ; выйдзе дапоўненае і пашыранае выданне пра Беларускі дзяржаўны універсітэт, якое, як мяркуецца, стане працягам кнігі “БДУ ў гады Вялікай Айчыннай вайны”, рыхтуецца самая розная сувенірная і паліграфічная прадукцыя. Непасрэдна перад юбілеем, у верасні-кастрычніку, адбудзецца шмат мерапрыемстваў, прымеркаваных да дня нараджэння БДУ.

Ці можаце вы сказаць, якія ўмовы для навучання і працы будуць створаны ў юбілейным годзе? Ці плануецца ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы БДУ?

— Мы на юбілей не разлічваем. І без гэтай даты вырашаем многія праблемы. На сённяшні дзень, калі гаварыць пра матэрыяльную базу, хачу нагадаць, што зусім нядаўна юрыдычны факультэт атрымаў у падарунак новы корпус. Асноўныя сродкі на рэканструкцыю гэтага будынка, каля 70 % ад агульнага кошту, былі затрачаны менавіта ў 2004—2005 навучальным годзе. Усяго на гэты праект было выдаткавана каля 14 млрд рублёў.

У будучым годзе мы плануем увесці ў строй 14-павярховы будынак факультэта міжнародных адносін. Універсітэт, згодна з узятымі на сябе яшчэ ў 2001 г. абавязкамі, нясе вялікія выдаткі з асабістых сродкаў. І было б зусім цяжка, калі б апошнія два гады нам не было фінансавай дапамогі з боку Прэзідэнта Беларусі.

1 – будынак факультэта міжнародных адносін; 2 – будучы будынак сацыяльна-культурнага прызначэння.

Але самымі галоўнымі падарункамі да гэтага свята для студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта стане адкрыццё пасля рамонту і рэканструкцыі спартыўнага комплексу БДУ, што знаходзіцца па вул. Кастрычніцкай, а таксама Музея гісторыі Белдзяржуніверсітэта, які размесціцца на першым паверсе галоўнага корпуса.

Па незразумелых прычынах музей перапыніў сваё існаванне і не функцыянуе ўжо на працягу 8 гадоў.

**— Магчыма, юбілейная дата нейкім чынам дапаможа вырашыць пэўныя праблемы па *тальны рамонт могуць скласці каля 12 млн долараў. Гэта самая вялікая лічба за ўсе гады існавання БДУ.*

Можа быць, назва аб’екта, будаўніцтва якога мы пачалі ў 2005-м, не такая гучная, але яна сапраўды грэе душу — гэта кацельня спартыўна-аздараўленчага комплексу “Брыганціна”. Прыкладны кошт — каля 1 млн долараў. Яна пачне працаваць у маі бягучага года. Чаму я надаю гэтаму такую ўвагу? Таму што будаўніцтва кацельні — ключ да таго, каб “Брыганціна” стала сапраўды ўтульнай базай адпачынку для ўсяго калектыву універсітэта, як для студэнтаў, так і для выкладчыкаў. І што вельмі важна — на працягу ўсяго года. Мы ўжо пачалі капітальны рамонт будынкаў комплексу “Брыганціна”, і ў бліжэйшыя некалькі гадоў поўнасцю ўсё адрамантуем і прывядзем у належны стан.

А вось да 90-годдзя, спадзяюся, ва універсітэцкім дворыку з’явіцца новы будынак сацыяльна-культурнага прызначэння; плануем таксама будаўніцтва студэнцкага інтэрната і, калі ўдасца, пачнем будаўніцтва другога. Думаем таксама пра рэканструкцыю галоўнага корпуса, капітальны рамонт будынка журфака па вул. Маскоўскай. Гаворка ідзе пра бліжэйшыя 5 гадоў. У далейшых планах — рэканструкцыя карпусоў па вул. К. Маркса і Чырвонаармейскай.

Акрамя ўсяго мы пастаянна займаемся бягучым рамонтам. Гэтая праца таксама вельмі важная і патрабуе значных выдаткаў.

Урэшце, матэрыяльная база — гэта не толькі будынкі. У бягучым навучальным годзе мы збіраемся набыць камп’ютарнай тэхнікі на суму каля 1 млн долараў. А ўжо з лютага пачнуць працаваць тры медыятэкі на 130 камп’ютараў. Яны размесцяцца ў будынках факультэта радыёфізікі і электронікі, геафака, а таксама ў будынку па вул. Рэвалюцыйнай. Гэта значна спросціць студэнтам доступ да Інтэрнэт-рэсурсаў.

Працягваем закупы навуковага абсталявання, паступова абнаўляем матэрыяльную базу навучальнага працэсу. У бліжэйшы час пры падтрымцы кітайскіх калег у БДУ будзе праведзена мадэрнізацыя нашага тэлекамунікацыйнага абсталявання, якая ацэньваецца больш чым у 1 млн долараў.

— Калі ўжо мы гаворым пра матэрыяльнае, то самы час успомніць пра нашыя заробкі. Якая карціна вымалёўваецца тут?

— У газеце ”Універсітэт” (№ 19 за 8 лістапада 2005 г.) былі надрукаваныя табліцы і графікі, што паказвалі розныя аспекты жыцця БДУ, у тым ліку графікі з дынамікай росту заработнай платы супрацоўнікаў універсітэта. Але на той час у нас былі звесткі не за ўвесь 2005 г. Сёння мы можам прывесці поўныя звесткі пра заработную плату за мінулы год.

Звесткі пра сярэднюю заработную плату работнікаў БДУ (2001—2005 гг.)



Як бачым з гэтага графіка, сярэдняя заработная плата прафесарска-выкладчыцкага складу за апошнія 2 гады вырасла амаль у 1,8 раза. Да гэтага трэба дадаць, што ўзровень інфляцыі ў 2004—2005 гг. быў у 2 разы меншым у параўнанні з 2002—2003 гг.

Рост заробку тлумачыцца некалькімі прычынамі: павелічэнне заработнай платы з боку дзяржавы, павелічэнне сродкаў, якія ідуць на аплату працы выкладчыкаў з пазабюджэтных сродкаў, і павелічэнне сродкаў на фінансаванне навукі за апошнія 2 гады.

Калі я прыйшоў у БДУ, ва універсітэце было вельмі няпростае матэрыяльнае становішча. Яно і цяпер застаецца нялёгкім. Але шэраг праблем нам удалося вырашыць у апошнія 2 гады, у тым ліку за кошт значнага пашырэння платнага навучання. І мы будзем такую лінію працягваць. Урэшце гэта адаб’ецца ў лепшы бок і на заробках супрацоўнікаў.

— Усе гэтыя высілкі па паляпшэнні матэрыяльна-тэхнічнага становішча накіраваныя, вядома, на падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў. Якім чынам будзе ўдасканальвацца сам навучальна-выхаваўчы працэс?

— Паляпшэнне матэрыяльнай базы, камп’ютарнага забеспячэння стварае лепшыя ўмовы для арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу. Але я хацеў бы нагадаць, што ў нас ёсць Стратэгія развіцця БДУ да 2011 г., распрацаваны 17 праграм па розных кірунках дзейнасці універсітэта, па якіх мы ўжо працуем.

Хачу падкрэсліць, што флагманам вышэйшай школы Беларускі дзяржаўны універсітэт можа называцца толькі ў тым выпадку, калі ён будзе пастаянна развівацца, калі зможа ажыццявіць пераход да сучасных формаў арганізацыі і вядзення навучальнага працэсу, што і з’яўляецца асноўнай мэтай, вызначанай праграмамі развіцця універсітэта.

Ужо пачынаюць вымалёўвацца контуры новага падыходу да арганізацыі самастойнай працы студэнтаў, якія прадугледжваюць як стварэнне Інтэрнэт-рэсурсаў, так і стварэнне ўмоў для ажыццяўлення творчай самастойнай кантраляванай работы студэнтаў.

— У снежні Вы сустракаліся з членамі студэнцкіх саветаў па якасці адукацыі факультэтаў. Акрэсліце, калі ласка, яшчэ раз ролю студэнтаў у паляпшэнні навучальна-выхаваўчага працэсу...

— Падчас сустрэчы я яшчэ раз упэўніўся, што без актыўнага прыцягнення студэнцтва да гэтага працэсу мы не зможам дасягнуць неабходных вынікаў. Студэнты старэйшых курсаў, а часам і трэцякурснікі, ужо здольныя зрабіць свой унёсак у распрацоўку некаторых навучальных праграм для студэнтаў малодшых курсаў, а таксама прымаць актыўны ўдзел у стварэнні тэставай сістэмы кантролю за самастойнай працай студэнтаў. Калі я вучыўся на IV—V курсе, то, мабыць, шэраг маіх сакурснікаў здолелі б скласці тэсты для I—II курсаў не горш за выкладчыкаў.

На прыродазнаўчых факультэтах, як правіла, больш складана студэнту адчуваць сябе на роўных з выкладчыкамі па глыбіні ведаў. Але што да студэнтаў гуманітарных факультэтаў, то яны па некаторых канкрэтных пытаннях могуць быць на ўзроўні выкладчыка, а значыць, у стане ўдзельнічаць у распрацоўцы навучальных планаў не толькі для першакурснікаў, але і для старэйшых курсаў. І такая работа можа разглядацца як курсавая ці дыпломная, а таксама заахвочвацца матэрыяльна. Супрацоўніцтва са студэнтамі неабходна наладжваць сумесна з дэканатамі, кафедрамі.

На маю думку, студэнцкі савет па якасці адукацыі на факультэце — гэта своеасаблівы студэнцкі калектыўны намеснік дэкана па вучэбнай рабоце.

Я ўпэўнены, што эфект ад выхаваўчай работы можа з’явіцца толькі праз значнае павелічэнне самастойнасці студэнтаў як у арганізацыі свайго студэнцкага жыцця, у тым ліку і ў інтэрнатах, так і праз актыўны ўдзел у навучальным працэсе. Для такога праяўлення творчасці ва універсітэце ёсць усе магчымасці.

Таццяна КАЗАК
Фота Аляксандра СНАПКА

ЮБІЛЕІ

НАЙЛЕПШЫ ПАДАРУНАК – ПОСПЕХІ ВУЧНЯЎ

Дырэктар ліцэя БДУ Таццяна Аляксандраўна КАЛЕВІЧ сёння, 26 студзеня, святкуе свой юбілей.

Другі год яна ўзначальвае настаўніцкі калектыў, усяго сумленна і аддана працуе ў ліцэі ўжо 16 гадоў. 10 з іх Таццяна Аляксандраўна вядзе курс хіміі па аўтарскай методыцы ў профільных класах ліцэя БДУ. Падрыхтавала больш за 50 прызёраў рэспубліканскіх алімпіяд, 15 пераможцаў міжнародных алімпіяд па хіміі.

Таццяна Аляксандраўна шчодра дзеліцца сваім педагагічным досведам з калегамі. Яна аўтар больш 50 работ па методыцы выкладання хіміі. Яе навучальна-метадычныя дапаможнікі карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод настаўнікаў і вучняў.

Бясконцая энергія, рашучасць, апантанасць, дынамізм, вынаходлівасць, працавітасць зачароўваюць усіх, каму шчасціць працаваць побач з Таццянай Аляксандраўнай.

За поспехі ў навучанні і выхаванні ліцэістаў, унёсак у развіццё алімпіяднага руху Т.А. Калевіч узнагароджана граматай Міністэрства адукацыі, Ганаровымі граматамі ўпраўлення адукацыі Мінгарвыканкама, значком "Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь". Двойчы ёй прысуджалі прэмію спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце паважаюць і цэняць шчырасць, адкрытасць, добразычлівасць і прынцыповасць гэтага цудоўнага чалавека, педагога, кіраўніка.

Сардэчна віншуем Таццяну Аляксандраўну з юбілеем! Жадаем здароўя, удачы, творчага даўгалецця, шчырай любові ўдзячных вучняў і калег.

ВЫДАТНЫ ПЕДАГОГ І НАВУКОЎЦА

Свой юбілей адзначыла нядаўна дацэнт кафедры фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў Марыя Віктараўна ЛАЎРЫНОВІЧ.

Нарадзілася яна 25 студзеня 1936 г. у мястэчку Івянец Мінскай вобласці. Тамсама атрымала і сярэднюю адукацыю. У 1958 г. яна паспяхова скончыла геаграфічны факультэт БДУ і пасля гэтага 2 гады працавала ў Інстытуце глебазнаўства АН БССР. Потым была асістэнтам кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін, з 1966 г. — старшым выкладчыкам, а з 1970 г. — дацэнтам кафедры фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў.

М.В. Лаўрыновіч са студэнцкіх гадоў займалася навуковай дзейнасцю па вывучэнні азёраў Беларусі. У 1967 г. яна абараніла кандыдацкую дысертацыю "Азёры заходняй часткі Беларускага Палесся". Лімналагічныя даследаванні заставаліся і надалей прадметам яе навуковага зацікаўлення. Таксама яна чытала курсы лекцый па біягеаграфіі і фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў. Марыя Віктараўна — аўтар 6 навучальна-метадычных дапаможнікаў і больш за 100 навуковых артыкулаў па фізічнай геаграфіі мацерыкоў. М.В. Лаўрыновіч з'яўляецца навуковым кансультантам і шматгадовым аўтарам "Беларускай Энцыклапедыі".

Вялікую ўвагу Марыя Віктараўна надае навуковай рабоце студэнтаў. Выкананыя пад яе кіраўніцтвам студэнцкія работы былі неаднаразовымі дыпламантамі рэспубліканскіх конкурсаў па прыродазнаўчых навуках. Кіруючы вытворча-азнаямляльнай практыкай студэнтаў, М.В. Лаўрыновіч выязджала ў Балгарыю, Венгрыю, Польшчу, Югаславію. У 1968 г. на працягу 6 месяцаў яна жыла ў Індыі.

Доўгія гады яна ўзначальвала таварыства "Веды" на геаграфічным факультэце, была куратарам студэнцкіх груп, старшынёй Савета кураторыяў Белдзяржуніверсітэта, цяпер уваходзіць у Саюз жанчын БДУ.

За шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць М.В. Лаўрыновіч узнагароджана Ганаровымі граматамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Ганаровымі граматамі БДУ, грамотамі Беларускага геаграфічнага таварыства.

Марыя Віктараўна — актыўны член спартыўных камандаў БДУ па лёгкай атлетыцы (шматбор'і), спорттаварыстваў "Буравеснік" і "Ураджай" (была ў зборнай камандзе ў 1951—1960 г.), пераможца і прызёр шматлікіх рэспубліканскіх і ўсесаюзных спаборніцтваў.

Акрамя таго, яна таленавіты педагог са шматгадовым досведам працы па падрыхтоўцы кадраў вышэйшай адукацыі ў Беларусі. Пад яе кіраўніцтвам пабачылі свет навучальныя дапаможнікі па флоры розных рэгіёнаў свету. Адной з першых на кафедры яна падрыхтавала навучальна-метадычны комплекс для курса "Фізічная геаграфія мацерыкоў". Марыя Віктараўна шырока выкарыстоўвае новыя інфармацыйныя тэхналогіі, што спрыяе паляпшэнню якасці падрыхтоўкі студэнтаў.

Віншуем Вас, Марыя Віктараўна!

Супрацоўнікі і студэнты геаграфічнага факультэта

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

МОЎНАЯ І ЛІТАРАТУРНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ: ПАД ЗНАКАМ САДРУЖНАСЦІ

Напрыканцы 2005 г. на базе філалагічнага факультэта БДУ адбыўся Рэспубліканскі навукова-практычны семінар "Актуальныя праблемы выкладання рускай мовы і літаратуры ў школах Беларусі", арганізаваны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Пасольствам Расійскай Федэрацыі ў Беларусі і нашым універсітэтам.

Хацелася б асабліва адзначыць, што ў падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемства прынялі ўдзел саветнік Пасольства Расійскай Федэрацыі К.К. Кузняцоў, а таксама старшыня аргкамітэта гуманітарных алімпіяд Н.А. Собалева, доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры літаратуры і методыкі выкладання літаратуры Смаленскага дзяржпедуніверсітэта, адзін з аўтараў серыі падручнікаў па рускай літаратуры Г.С. Меркін і інш. Разам з навукоўцамі Беларусі ў мерапрыемстве ўдзельнічалі педагогі-практыкі як з Мінска, так і з усіх рэгіёнаў нашай краіны.

Адкрыў працу семінара ўступнай прамовай дэкан філалагічнага факультэта БДУ прафесар І.С. Роўда. З урачыстымі прывітаннямі да ўдзельнікаў семінара звярнуліся намеснік міністра адукацыі Беларусі К.С. Фарыно і першы сакратар Пасольства Расійскай Федэрацыі А.С. Ламакін.

У дакладах удзельнікаў семінара асвятляліся стратэгічна значныя пытанні моўнай і літаратурнай адукацыі: праблемы развіцця асобы школьніка на занятках па рускай мове; падрыхтоўка навучальна-метадычных комплексаў па мове і літаратуры; распрацоўка канцэптуальных асноў стварэння сучасных праграм і падручнікаў па рускай літаратуры для школ Беларусі ва ўмовах рознаўзроўневага навучання; выкладанне літаратуры з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій; фарміраванне агульнавучэбных камунікатыўных уменняў школьнікаў; стварэнне адукацыйнага асяроддзя, якое спрыяла б павышэнню іх матывацыі да вывучэння філалагічных дысцыплін; удасканаленне ўменняў аналізу паэтычнага тэксту падчас падрыхтоўкі да прадметных алімпіяд; праблема пошуку гармоніі паміж зместам і формай сучаснага ўрока літаратуры і інш. Для прэзентацыі асноўных палажэнняў і прыкладаў часткі дакладаў выкарыстоўвалася відовізшчнае мультымедыйнае суправаджэнне.

У межах семінара арганізоўвалася пасяджэнне працоўнай групы па праблемах правядзення Рэспубліканскай алімпіяды па рускай мове. Вылучаны цікавыя прапановы, якія датычацца ўдакладнення крытэрыяў ацэнкі прадэманстраваных вынікаў і пашырэння колькасці варыянтаў заданняў на алімпіядных конкурсах. (У прыватнасці, абмяркоўвалася магчымасць для вучняў у якасці варыянта задання праявіць сябе не толькі ў вымаўленні публіцыстычнага выступлення, але і ў падрыхтоўцы творчага вуснага сачынення на лінгвістычную альбо літаратурную тэму.) Гучала і прапанова правесці Рэспубліканскую алімпіяду па рускай літаратуры.

Праграму аднаго з дзён семінара завяршыў канцэрт класічнай і эстраднай музыкі. У ім выступілі вядомы артыст з Расіі Ігар Чарноў (лаўрэат спецыяльнай прэміі журы VII Міжнароднага конкурсу ў Іспаніі, які стажыраваўся ў оперных школах Аўстрыі, Іспаніі, Італіі, выканаўца оперных арый і рамансаў) і таленавітыя маладыя артысты Беларусі, у тым ліку вядучы музычнай тэлеперадачы Вячаслаў Статкевіч, былая салістка ансамбля "Бяседа" Анжэла Макарава, шоу-балет "Феерыя" і інш., неаднаразовыя пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў.

Ірына ТАЯНОЎСКАЯ

АБ'ЯВЫ

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ: кафедры мастацтваў, кафедры сацыяльнай работы.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

Н.А. Поклонский, Н.И. Горбачук. **Основы импедансной спектроскопии композитов.** У курсе лекцый выкладаюцца асновы імпеданснай спектраскапіі кампазіцыйных матэрыялаў. Падаюцца неабходныя звесткі і азначэнні з электрафізікі гетэрагенных сістэм і тэорыі працякання.

А.Ф. Літвіновіч. **Традыцыйная культура беларусаў у польскай перыёдыцы другой паловы XIX — пачатку XX ст.** У навучальным дапаможніку ўпершыню сістэматызаваны, даследаваны і абагульнены працы па беларускай фальклярыстыцы і матэрыялы па вусна-паэтычнай творчасці беларусаў, апублікаваныя ў польскіх выданнях. Кніга мае шмат ілюстрацый.

С.В. Кавалёў. **Гісторыя беларускай літаратуры: другая палова XVI ст.** Курс лекцый прысвечаны гісторыі беларускай літаратуры другой паловы XVI ст. — цікаваму і спецыфічнаму перыяду ў развіцці айчыннага пісьменства, недастаткова асветленаму ва універсітэцкіх падручніках. Асновай для напісання дапаможніка сталі аўтарскія даследаванні шматмоўнай літаратуры Беларусі позняга Рэнесансу, а таксама найноўшыя публікацыі беларускіх і польскіх медыевістаў.

Основы эффективного использования энергетических ресурсов. Навучальны дапаможнік разглядае пытанні глабальнага ўплыву энергетыкі на ўстойлівае развіццё сусветнай цывілізацыі і экалагічны стан планеты, апісвае стан сусветнай энергетычнай сістэмы, а таксама энергетычнай сістэмы Беларусі.

Г.И. Шевченко. **Фразеологизмы античного происхождения в славянских языках.** У манаграфіі даецца глыбокі моўны і культуралагічны аналіз лацінскіх і грэчаскіх фразеалагізмаў, якія паслужылі крыніцай для адпаведных славянскіх. На шырокім гістарычным фоне паказваецца пранікненне фразеалагічных адзінак антычнага паходжання ў славянскія мовы.

Политические партии Республики Беларусь. У даведніку друкуюцца праграмы сучасных палітычных партый Беларусі, даецца кароткая характарыстыка кожнай з іх.

М.Ф. Арсентьева, И.Н. Маевская. **Practisches Deutsch/Практический немецкий.** Дапаможнік нямецкай мовы складаецца з чатырох частак, якія ўключаюць праграмныя тэксты з арыгінальных крыніц, лексічны і граматычны матэрыял, разлічаны на развіццё ўменняў і навыкаў вуснага маўлення, чытання, перакладу і рэферыравання аўтэнтычнай літаратуры.

English: Introducing Social Sciences and Journalism in dialogues, monologues and polilogues/Английский язык: Введение в социальные науки и журналистику в диалогах, монологах и полилогах. Навучальны дапаможнік англійскай мовы дазволіць навучэнцам атрымаць пачатковыя навыкі прафесійна арыентаваных дыскурсійных практык у галіне грамадскіх ведаў і журналістыкі.

Studia philological. Выпуск VI. У шостым выпуску зборніка навуковых артыкулаў "Філалагічныя штудыі" прадстаўлены артыкулы, прысвечаныя праблемам класічнай філалогіі, рэцэпцыі антычнай культуры ў еўрапейскую. Таксама асвятляюцца праблемы грэкалацінскай тэрміналогіі, даюцца пераклады з лацінскай мовы на беларускую.

Белорусский государственный университет: состояние и перспективы развития учебно-воспитательного процесса факультетов. Зборнік дакладаў выйшаў у дзвюх частках. У яго ўвайшлі даклады кіраўнікоў факультэтаў, інстытутаў і юрыдычнага каледжа БДУ на пашыраных пасяджэннях рэктарата універсітэта, прысвечаных усебаковаму аналізу стану вучэбна-выхаваўчага працэсу і перспектываў стратэгічнага развіцця, вызначаных рашэннем Вучонага савета БДУ 24 чэрвеня 2004 г.

Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы

УНІВЕРСІТЭТ

26 студзеня 2006 года, № 2 (1932)

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

ДНІ ЗДАРОЎЯ Ў "БРЫГАНЦІНЕ"

3—5 лютага ў спартыўна-аздараўленчым комплексе "Брыганціна" адбудуцца "Дні здароўя", арганізаваныя пры падтрымцы прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў БДУ. У межах мерапрыемства плануецца правядзенне спаборніцтваў па перацягванні каната, па плаванні і спаборніцтва па лыжах.

Сняжана ЛІСОЎСКАЯ

АКЦЫІ

ПРАФСАЮЗЫ — ДЗЕЦЯМ

У дні навагодніх святаў у межах агульнанацыянальнай акцыі "Прафсаюзы — дзецям" прадстаўнікі пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ з падарункамі наведалі Дулебскую агульнаадукацыйную школу-інтэрнат з сацыяльным прытулкам. У школе-інтэрнаце жывуць і навучаюцца 55 дзяцей рознага ўзросту.

Ад імя нашага універсітэта старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Н.М. Радзевіч уручыла выхаванцам школы камплект дзіцячай літаратуры, а таксама кнігі пра Белдзяржуніверсітэт. Дабрачынная акцыя была падрыхтавана прафкамам пры падтрымцы Саюза жанчын БДУ. Асаблівая падзяка — дэкану геаграфічнага факультэта І.І. Пірожніку.

"Для прафкама студэнтаў БДУ гэтая акцыя стала першым дабрачынным мерапрыемствам па-за межамі нашага універсітэта, — адзначыла Н.М. Радзевіч, — але мы спадзяемся і ў будучым удзельнічаць у акцыях накшталт гэтай. Наша ўвага і дапамога патрэбна многім людзям!"

Сняжана ЛІСОЎСКАЯ

СТУДЭНТЫ Ў РОЛІ ДЗЯДОЎ МАРОЗАЎ І СНЯГУРАК

Студэнты Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій удзельнічаюць у дабрачыннай праграме "Дзед Мароз прыходзіць у дом", якую арганізоўвае аб'яднанне "Альтэра" ўжо на працягу 3 гадоў. Напярэдадні Новага года ўдзельнікі акцыі павіншавалі больш за 300 дзяцей. Сёлета віншавальная акцыя доўжылася два тыдні.

Гарадская маладзёжная арганізацыя "Альтэра" ўзнікла 5 гадоў таму: старшакурснікі мінскіх ВНУ стварылі валанцёрскае аб'яднанне, каб наведваць выхаванцаў дзіцячых дамоў, а напярэдадні Новага года — віншаваць непаўнагадовых інвалідаў.

Амаль месяц да позняга вечара ладзіліся рэпетыцыі міні-спектакляў, забаўляльных гульняў. Падрыхтаваная была процьма загадак, якія дужа любяць разгадваць дзяўчынкі і хлопчыкі.

Гарадскі Дзед Мароз прыехаў на конях, а яго таксама граў на гітары, мама спявала з сынам, а потым усе па чарзе чыталі вершы. У іншай сям'і дзяўчынка, якая пакутуе на цэрэбральны паралюш, паказвала свае малюнкі. Яны проста зачаравалі гасцей сваёй непасрэднасцю.

Адкуль падарункі ў Дзядоў Марозаў? Нам тэлефануюць мінчане і прапануюць цацкі, цукеркі, фламастары, каляровыя алоўкі, альбомы.

А 27 снежня ў Нацыянальным цэнтры творчасці дзяцей і моладзі адбылося свята для дзяцей-інвалідаў, на якое сабралося каля 300 удзельнікаў. Тутсама прайшоў баль-маскарад для Дзядоў Марозаў і Снягурак, дзе атрымалі падарункі ўжо яны.

Удзень студэнты здавалі залікі, а па вечарах у касцюмах Дзеда Мароза і Снягуркі, лясных звяркоў і казачных персанажаў спяшаліся з навагоднімі падарункамі да дзятвы. Уражанняў было багата. У адной сям'і для Дзеда Мароза падрыхтавалі цэлы канцэрт:

Яніна КУПЦОВА

У ВОЛЬНЫ ЧАС

КОЖНАЙ ПРЫГАЖУНІ — СВОЙ ТЫТУЛ

Напрыканцы снежня ў клубе "Madison" адбыўся фінал конкурсу прыгажосці "Міс ДзІКСТ 2005—2006".

На працягу ўсяго вечара ў цэнтры ўсеагульнай увагі былі сем удзельніц — першакурсніцы Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій Марыяна Андрушчанка і Алена Стэльмаховіч, другакурсніцы Паліна Пілецкая, Юлія Мельнічэнка, Настасся Стражэвіч, трэцякурсніца Таццяна Ібрагімава і чацвертакурсніца Вольга Сінкевіч. У журы ўвайшлі прадстаўнікі адміністрацыі, загадчыкі кафедраў, выкладчыкі і прадстаўнікі студэнцкага самакіравання, а таксама... усе прысутныя ў зале гледачы — яны выбіралі "Міс глядацкіх сімпатыяў".

Удзельніцы дэманстравалі сябе ў шматлікіх конкурсах — "Візітоўка", "Творчы конкурс", "Дэфіле", "Сюрпрыз", "Слайд-шоу".

На фінішы намінацыі размеркаваліся наступным чынам: "Міс Гламур" — В. Сінкевіч, "Міс Грацыя" — Ю. Мельнічэнка, "Міс Жаноцкасць" — А. Стэльмаховіч, "Міс Абаяльнасць" — П. Пілецкая, "Міс Мара" — Н. Стражэвіч. Тытул "Міс глядацкіх сімпатыяў" атрымала Т. Ібрагімава. А пераможцай конкурсу і ўладальніцай "Міс ДзІКСТ 2005—2006" стала М. Андрушчанка.

Закончылася свята дыскатэкай, якая зацягнулася да самага світанку.

Вераніка СТАТКЕВІЧ

З УСМЕШКАЙ

ЗДАЎ СЕСІЮ — ГУЛЯЙ ВЕСЕЛА!

Студэнт выходзіць з аўдыторыі. Таварышы яго пытаюцца:

— Што, здаў?

— Ды нібыта здаў!

— А што пыталіся?

— А халера яго ведае! Пыталіся ж па-англійску...

***

— Чым адрозніваецца прафесар ад студэнта?

— Прафесар — гэта студэнт, які здаў УСЕ экзамены.

***

Студэнт:

— Я не лічу, што заслужыў такую нізкую адзнаку.

Прафесар:

— Я таксама так не думаю, але ніжэйшай, на жаль, няма.

***

Прафесар — свайму маладому калегу:

— Падчас экзамену не глядзіце ўважліва на студэнта. Ён можа падумаць, што вы падазраеце яго ў спісванні, і пакрыўдзіцца.

***

Дыялог двух студэнтаў:

— Ты ведаеш, што цябе ўжо адлічылі?

— Праўда? А я хацеў яшчэ сёння прагуляць заняткі...

***

Размаўляюць два выкладчыкі:

— Трываць не магу, калі на семінары студэнты глядзяць на гадзіннікі.

— Гэта яшчэ нічога. А вось калі яны пасля падносяць іх да вуха...

АБ'ЯВЫ

САНАТОРЫЙ ЗАПРАШАЕ СТУДЭНТАЎ

У студэнтаў БДУ ёсць вельмі добрая магчымасць не толькі паправіць сваё здароўе (што асабліва актуальна пасля сесіі) і прадухіліць некаторыя захворванні, але і забяспечыць сябе штодзённым 3-разовым харчаваннем на працягу 21 дня.

У санаторыі-прафілакторыі БДУ (вул. Курчатава, 6, інтэрнат № 3) кожны студэнт пасля кансультацыі з дактарамі атрымоўвае якасную лячэбную дапамогу, лекі і вітаміны, а таксама талоны на харчаванне, сума якіх, адзначым, перавышае кошт пуцёўкі аж у 6 разоў. Асноўнымі метадамі аздараўлення з'яўляюцца вада- і электралячэнне, інгаляцыі і фітатэрапія, лячэбная фізкультура і масаж. Лячыцца можна паралельна з навучаннем, выбраўшы зручны для сябе час згодна з графікам работы лячэбных кабінетаў.

Аздаравіцца ў санаторыі-прафілакторыі мае права кожны студэнт БДУ. Для гэтага неабходна падаць ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю (прасп. Незалежнасці, 4, пакой 204, тэл. 209-52-75, будні дні з 8.30 да 17.15) наступныя дакументы:

заяву, падпісаную намеснікам дэкана, на імя старшыні камісіі па аздараўленні з указаннем тэрмінаў заезду;

медыцынскую даведку (форма 070 у-02) для атрымання пуцёўкі ў санаторна-курортную ўстанову (можна ўзяць у тэрапеўта па месцы жыхарства).

Таксама неабходна мець пры сябе 15.330 рублёў для аплаты кошту пуцёўкі.

Графік заездаў у санаторый-прафілакторый у 2006 г.:

2—22 лютага;
27 лютага — 20 сакавіка;
23 сакавіка — 12 красавіка;
17 красавіка — 10 мая;
15 мая — 4 чэрвеня;
7—27 чэрвеня;
4—24 верасня;
26 верасня — 16 кастрычніка;
19 кастрычніка — 9 лістапада;
13 лістапада — 3 снежня;
6—27 снежня.

Графік работы лячэбных кабінетаў:

Панядзелак, серада — з 9.00 да 16.00
Аўторак, чацвер — з 12.30 да 19.20
Пятніца — з 9.00 да 15.00

Вольга КАЗАКОВА, загадчыца сектара сацыяльнай работы ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

26 студзеня 2006 года
Падпісана да друку 25.01.2006 г.
Зак. 82. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра Саламахіна
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by